Дзяржаўная ўстанова культуры
”Сенненская цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма“
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

## *Гісторыка-краязнаўны зборнік традыцыйных свят і абрадаў Сенненскага краю*

# *”З крынічак памяці народнай“*



*2024 год*

**”З крынічак памяці народнай“:** гісторыка-краязнаўчы зборнік традыцыйных свят і абрадаў Сенненскага краю / Дзяржаўная ўстанова культуры ”Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“, Аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; [склад. Т.М. Красноўская, К.В. Догіль, адказны за выпуск А.І. Мяцеліца]. – Сянно, 2024. – 52 с.

г.Сянно, вул. Савецкая, 9
тэлефон: 8 02135 4 32 62
эл. пошта: bibliosen@yandex.by
сайт: http://cbs-senno.by/

# ПРАДМОВА

***Беларускі народ па праву можа ганарыцца сваёй багатай спадчынай, унікальнай культурай, народнымі святамі і абрадамі, непаўторным фальклорам, дзе ярка адлюстраваліся яго высакародныя ідэалы, прага да плённай працы, маральная чысціня душы, здольнасць да глыбокіх пачуццяў, практычная і філасофская мудрасць, любоў да свайго роднага краю і ўсё тое лепшае, чым і для чаго жыве чалавек. Вывучэнне мінулага дазваляе абнавіць карціну жыцця нашых продкаў, паказаць вытокі сучаснасці. У кожным сяле ёсць свае спецыфічныя рысы гісторыі і культуры, той адметны вобраз, які фарміруе ў чалавека цікавасць і прыхільнасць да краязнаўства.***

***Асобнае месца ў беларускім фальклоры займаюць народныя песні. Нездарма кажуць: "Песня – душа народа". І гэта сапраўды так. Вясёлыя і сумныя, лірычныя і жартоўныя, абрадавыя і пазаабрадавыя, заўсёды мілагучныя, прыгожыя, поўныя вялікага хараства і шчырасці, беларускія песні – гэта велізарная найкаштоўнейшая энцыклапедыя жыцця нашага народа. Багатыя векавечныя традыцыі і высокаэтычная вартасць беларускай народнай песні забяспечылі ёй неўміручасць. Яна бытуе і сёння, застаючыся духоўнай повяззю пакаленняў, крыніцай***

***радасці, творчага натхнення, сродкам далучэння да сапраўдных каштоўнасцей. Народныя песні спяваліся ў час каляндарных і сямейных абрадаў, у час працы і адпачынку, з любой нагоды і проста для душы. Нашы продкі віталі песняй і надыход вясны, і з’яўленне на свет новага чалавека, дзякавалі маці-зямлі за добры ўраджай, скардзіліся, выказвалі свае мары, надзеі, пажаданні, дзякавалі Богу за кожнае імгненне жыцця.***

***Запрашаем Вас пазнаёміцца з традыцыйнымі святамі, абрадамі і песнямі Сенненскага краю.***

## КАЛЯДЫ

Каляды – адно з самых старажытных масавых святаў земляробчага календара. Народнае зімовае свята, якое азначае паварот сонца з зімы на лета.

Калядныя святы пачыналіся з дня Божага Нараджэння – Раства. Калі першая зорка з’яўлялася на небе, уся сям’я садзілася за стол, засланы белым абрусам, пад які клалі сена. Запаліўшы свечку і памаліўшыся, пачыналі вячэраць.

У час Каляд наладжвалі калядаванне, варажбу, шматлікія забавы, гульні, спявалі песні. Важнай часткай Каляд былі хаджэнні групы калядоўшчыкаў: Зорканошы, Механошы, Музыкі, Цыгана з Казой, Канём, Мядзведзем, Жоравам. Яны віншавалі гаспадароў хаты, жадалі ім дабра і заможнасці, услаўлялі іх працавітасць і шчодрасць. А ў адказ атрымлівалі пачастункі.

# *КАЛЯДНЫЯ ПЕСНІ*

## *Запісана са слоў Яроменкі Алы Канстанцінаўны (1940 г.н.), якая пражывала ў в.Дамашэва Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*



Ой, ты, бабачка, стара
галачка.
Добры вечар!
За стаўбом сядзіць, салому
таўчэ.
Салому таўчэ, пірагі пячэ.
А сена смажыць, пірагі
мажыць.
Чорны волішча той дроў прывязе,
А павелішча той жар заграбе,
А памелішча той печ замяце.
Ой, ты, бабачка, стара галачка,
На пячы сядзіць, чырвонцы лічыць

***

А ў заінькі тры думанькі, Каляда
Адна дума полем бегчы
Друга дума лесам бегчы
Трэця дума морам плыці
Полем бегчы – стральцы заб’юць
Лесам бегчы – ваўкі з’ядуць
Морам плыці – утаплюся

Каля печы – не баюся
Ты, гаспадыня, не ляніся
Каля печы павярніся
Кішку з печы, каўбасу з плечы
Чарку гарэлкі, сыру на талеркі.

***Запісана са слоў Стральцовай Ліліі Фёдараўны, (1935 г.н.), якая пражывае ў в.Марозаўка Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

Ой ходзіць, ходзіць месяц па небу
Святы вечар
Ой просіць, просіць зорак з сабою
Зоркі-зорнічкі, мае сястрынкі
Ходземце з намі, Бога шукаці
Ой знайшлі Бога ў Мікалая ў хаце
За сталом сядзіць, тры свечкі гарыць
Тры свечкі гарыць, тры кубкі стаіць
А ў адным кубку піва кудрава
А ў другім кубку віно зеляно
А ў трэцім кубку мядок саладок
Мядок саладок, божанькі слядок.



## *Запісана ў аграгарадку Ходцы Ходцаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

## Го-го-го, каза…

Го – го – го, каза!
Го – го, шэрая!
Дзе рогі дзела?
На соль праела:
Соль дарагая,
Мера скупая.
Не дыбай каза,
Крывыя ногі,
Не станавіся
Цераз дарогі:
Будзе ехаць пан –
Казу разаб'е!
На табе ляску
У залёты йсці –
Папіраціся –
Чорт цябе бярэ
І з залётамі.

Ёсць у мяне конь
За варотамі,
У даліне каза
З казлянятамі,
За гарою воўк
З ваўчанятамі,
Як прабег ваўчок
За козку ды ўцёк,
А ваўчанята
За казлянята:
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе не бывае,
Там вылягае,
Дзе каза ступіць,
Там яно кусціць.



## Як пайшла Каляда

Як пайшла Каляда
Упярод Ражства,
Каляда, Каляда!

Прынесла ж Каляда
Рэшата бліноў,
Рэшата бліноў,
Берасцень мёду.

Дзеткі блінамі
У мёд макалі,
У мёд макалі, Каляду ўспаміналі.

## Добры вечар таму, хто у гэтым даму…

Добры вечар таму, хто у гэтым даму,
Добры вечар добрым людзям!
А у гэтым даму сам пан гаспадар,
Шчодры вечар добрым людзям!
Сам пан гаспадар да й на покуце,
Шчодры вечар добрым людзям!
Дай на покуце ўвесь у золаце,
Шчодры вечар добрым людзям!
Ой, каля яго да й жана яго!
Шчодры вечар добрым людзям!
Ой, каля яе дзетачкі яе,
Шчодры вечар добрым людзям!

## Ці дома, дома сам пан гаспадар?...

Ці дома, дома сам пан гаспадар?
Святы вечар, святы Васілёў!
Ой, калі ты спіш – Гасподзь з табою,
А калі не спіш – гавары са мною,
А не са мною – з сваёй жаною,
А не з жаною – з сваімі дзеткамі,
А не з дзеткамі – то з суседкамі,
Не з суседкамі – з добрымі людзьмі,
З добрымі людзьмі, што к табе прыйшлі,
То трое гасцей, трое радасцей:
Ой, первы госцік – яснае сонца,
А другі госцік – дробненькі дожджык.
Усхвалявалася яснае сонца:
- Ой, як я ўзыду ў нядзельку рана,
То ўзрадуецца ўвесь мір хрышчоны,
Увесь мір хрышчоны да й нараджоны.
Ой, усхваляваўся свецел месячык:
- Ой, як я ўзыду ўночы-паўночы,
То зрадуецца шчука ў моры,
Шчука ў моры, а звер у полі,
А звер у полі, купец у дарозе.
Ой, усхваляваўся дробненькі дожджык:
- Ой, як я пайду тройкай у маю,
То зрадуецца жыта-пшпніца,
Жыта-пшаніца, усяка пашніца.

## *Запісана ў аграгарадку Машканы Машканскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

А ці дома, дома сам пан гаспадар
Святы вечар добрым людзям
А колі ён дома, хай выйдзе на двор
Хай выйдзе на двор ды зірне ў шчыры бор
У шчырым бару шуміць і гудзе
І шуміць, і гудзе, два раёчкі ідзе
Першы раёчак ды нясе вашчочак
А другі раёчак нясе мядочак
Ці свечы сукаці ды дачок аддаваці
Свету сыціці ды сыноў жаніці.

***

Ого-го, каза
Ого, дзераза
Дзе рогі падзела
На соль прамяняла
Соль дарагая
Мера скупая
Ох ты, козанька
Ня будзь гордзенька
Расхадзіся ты па ўсяму двару
Пакланіся нізенька
Як гаспадару, як гаспадыні
Дайце казе сена
Каб каза прысела
Дайце казе сала



Каб каза ўстала
На пячы авёс
Вялікі парос
На падлозе жыта
Нагамі збіта
А ў тым жыце перапеліца
Вывела дзяцей
Люба глядзець
Го-го –го, каза
Го-го, дзераза
Нут-ка казачна расхадзіся
Па ўсяму двару
Па баярскаму
Баярын ідзе, каляду нясе
Мерачку аўса
На верх каўбаса
А яшчэ пірог,
Каб двара сцярог
Дзе каза хвастом
Там жыта стагом
Ой, калядачкі набліжаюцца
А каўбасачкі паніжаюцца



## *Запісана ў в. Вялікі Азярэцк Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

## Шчодры вечар



На нова лета
Хай родзе жыта
Шчодры вечар
Багаты вечар
Шчодры вечар
Багаты вечар

Стань на драбінку
Дастань саланінку
Шчодры вечар
Багаты вечар
Шчодры вечар
Багаты вечар

Стань на баляску
Дастань каўбаску
Шчодры вечар
Багаты вечар
Шчодры вечар
Багаты вечар.

***Запісана са слоў Пагарэльскай Ларысы Іванаўны, (1961 г.н.), якая пражывае ў аграгарадку Студзёнка Студзёнкаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

Па небачку зорка коціцца, ой люлі- люлі ,
зорка коціцца
А сястрыцы к брату у госці хочацца, ой люлі- люлі ,
у госці хочацца

Як падумаю, так сабралася, ой люлі- люлі ,
так сабралася.

Убірай муж хлеб-соль са стала, ой люлі- люлі,
хлеб ды соль,

Едзе ў госці сястра, ды бедная , ой люлі- люлі ,
сястра, ды бедная.

Не хавай ежу, ад сястры яду, ой люлі- люлі,
ад сястры яду,

Не ўбірай братка, хлеб ды соль ад стала, ой люлі- люлі , хлеб ды соль ад стала,

Не прыехала к табе абедаці, а прыехала брата адведаці, ой люлі- люлі , брата адведаці.

Ты прыедзь, браток , у маю буду,

Я ж цябе , браток, частаваць буду, ой люлі- люлі ,
частаваць буду,

Я падам табе хлеб ды соль на стол, заллю віно за каўнер, ой люлі- люлі , віно за каўнер.

***Запісана са слоў Філонавай Мальвіны Аляксандраўны, (1936 г.н.), якая пражывала ў в. Кавалі Студзёнкаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

Ой, калядныя , бліны ладныя , ой люлі- люлі , бліны ладныя
А калядачкі прыбліжайцеся, а каўбасачкі паніжайцеся,
ой люлі- люлі , паніжайцеся
А калядачкі прыблізіліся, а каўбасачкі панізіліся,
ой люлі- люлі , панізіліся,
Ой, калядныя , бліны ладныя , ой люлі- люлі , бліны ладныя
Тубу-тубу на пагосце прыехалі да вас госці

Не старыя , не малыя , калядачкі удалыя,

Добры вечар , шчодры вечар.

## МАСЛЕНКА (СЫРНЫ ТЫДЗЕНЬ)

Масленка, Масленка, нясі сыру, масла нам, каб зімачка згасла! Старажытнае язычніцкае свята. У гэты тыдзень праводзяць зіму. Сёння Сырны тыдзень болей вядомы як Масленка. Шмат стагоддзяў у беларусаў сыр быў самым папулярным прадуктам і сімвалізаваў нараджэнне новага жыцця. У гэты тыдзень дзяўчаты і хлопцы ладзілі гушканне на арэлях, коўзанне з горак

на санках. Верылі, што чым вышэй узляціш на арэлях, чым далей скоцішся з горкі – тым даўжэйшы будзе лён. На Масленку ласуюцца блінамі, спяваюць масленічныя песні.

***Запісана са слоў Бярговінай Антаніны Уласаўны, якая пражывала ў в. Пацкава Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

## У нас сёння Масленка

У нас сёння Масленка.
Ой, люлі, люлі, Масленка!
Прыляцела ластаўка.
Ой, люлі, люлі, ластаўка!
Села па-на жэрдачку,
Ой, люлі, люлі, жэрдачку!
Шчабятала вестачку,
Ой, люлі, люлі, вестачку!
Што ў вёсцы дзеецца,
Ой, люлі, люлі, дзеецца!
Дзевяць хлопцаў жэняцца,
Ой, люлі, люлі, жэняцца!
Адна дзеўка замуж ідзець,
Ой, люлі, люлі, замуж ідзець!
Карагод з сабою вядзець,
Ой, люлі, люлі, карагод вядзець!



***Запісана са слоў Астрашаб Ніны Сцяпанаўны (1947 г.н.), якая пражывае ў пасёлку Труд Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***



А мы Масленку дажыдалі,
Люлі-люлі дажыдалі.
Сыра с маслецом праблюдалі,
Люлі-люлі праблюдалі.

Ды на горачку вынасілі,
Люлі-люлі вынасілі.
Сырам горачку ўсыпалі,
Люлі-люлі ўсыпалі.
Маслам горачку палівалі,
Люлі-люлі палівалі.
А ты, горачка, будь катліва,
Люлі-люлі будь катліва.
А свякровушка варкатліва,
Люлі-люлі варкатліва.
Усю нядзелюшку варкутала,
Люлі-люлі варкутала.
На горачку не пускала,
Люлі-люлі не пускала.

А нам дома не сядзіцца,
Люлі-люлі не сядзіцца.
Ахота з горачкі пракаціцца,
Люлі-люлі пракаціцца.
А на горачцы сняжкі пышуць,
Люлі-люлі сняжкі пышуць.
А нас мамухны дамой клічуць,
Люлі-люлі дамой клічуць.

## *Запісана ў аграгарадку Машканы Машканскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

А у нас сёння Масленіца, Масленіца
Прыляцела ластавіца, ластавіца
Прынясла бліны ў рэшаце, у рэшаце
Паставілі на стаўбе, на стаўбе
А вы, хлопцы, не зявайце , не зявайце
Вы гэтыя бліны пацягайце, пацягайце…
Масленка-красненька!
Чаго Масленкі ды ня сем нядзель?
Масленка-красненька!
Чаго Масленкі адна нядзелька?
Масленка-красненька!
Адна нядзелька,тая караценька.
Масленка-
красненька.



## *Запісана ў в. Соіна Ходцаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*



У нас сягоння Масленіца,
Даганяйце ў чыстым полі!
Прыляцела ластавіца,
Папытайце ў ластавіцы,
Села-пала на жэрдачку,
Што дзееца ў Соіне,
Шчабятала вестачку.
А ў Соіне дзеецца,
Ластавіца песню спела,
Дзевяць хлопцаў жэніцца,
Назад у поле паляцела.
Адна дзеўка замуж ідзе,
Садзіцеся, вы хлопцы на коні,
У карагод дзевак вядзе.

## Наша Масленіца гадавая…



Наша Масленіца гадавая,
Яна госцейка дарагая.
Яна пешаю к нам не ходзіць –
Усё на коніках раз'яджае.
Штобы конікі былі вараныя,
Штобы слугі былі маладыя.

## *Песні, запісаныя са слоў Кундзікавай Лідзіі Сямёнаўны, якая пражывала ў в. Бабаедава Нямойтаўскага Савета Сенненскага раёна*

### Вясна-вясняначка

Ой, вясна, вясна-вясняначка,
Дзе ж твая дачка Мар’яначка?
Дзе ж твая дачка Мар’яначка?
Ой, вясна, вясна-вясняначка.



Паганю бычка па раначку,
А сама сяду на ганачку.
А сама сяду на ганачку,
Паганю бычка па раначку.

Ты пасіся, бычок, па раначках,
А я пасяджу на ганачках.
А я пасяджу на ганачках,
Ты пасіся, бычок, на раначках.

Ты пасіся, бычок, пад ліпкамі,
А я паскачу пад скрыпкамі.
А я паскачу пад скрыпкамі,
Ты пасіся, бычок, пад ліпкамі.

Ты пасіся, бычок, пад гумнамі,
А я паскачу пад бубнамі.
А я паскачу пад бубнамі,
Ты пасіся, бычок, пад гумнамі.

# ВЯЛІКДЗЕНЬ

Вялікдзень – гэта свята лічыцца найвялікшым каляндарным святам. Яно складае выключную адметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочнага каляндара. Апошняй нядзеляй перад святам была Вербная нядзеля. У царкву заносілі галінкі вярбы, якія асвяшчалі святой вадой. Потым прыносілі дамоў і з’ядалі па аднаму пухірку, каб абараніцца ад маланкі, а рэшткі вярбы захоўвалі да наступнай Вербніцы.

Увесь гэты тыдзень прыгатаўляюцца пячэнні, саленні, варэнні і іншыя стравы, прымеркаваныя на ўсе тры першыя дні, бо варыць святочнымі днямі грэшна. У Вялікі чацвер пачынаецца ўборка хаты. Вымываюцца і вышароўваюцца вехцем сцены, лавы, сталы; вымываецца падлога, выскрабаецца падпечак. У Вялікую суботу на абразы павешаны чыстыя намёткі, на стол пастаўлены яйкі, пафарбаваныя шалупіннем цыбулі. Прыгатаваны розныя стравы: кулічы, тварожная пасха, кіндзюк, каўбасы…

Радаўніца адзначаецца праз тыдзень пасля Вялікадня, заўжды на аўторак. Спачатку ідуць памінаць блізкіх у царкву, а потым на могілкі.



## *Запісана ў в.Ульянавічы Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*



Вясна красна на ўвесь свет!
А ў гэтым даму – гаспадынечка,
Гаспадынечкай, журавінчкай,
Ці спіш, ці ляжыш, ці адпачываеш?
А калі ты спіш – Бог з табою,
А калі не спіш – гукай са мною.
А ўстанеш раненька, умыйся беленька,
Умыйся беленька, утрыся сухенька,
Утрыйся сухенька, ой прыбярыся.
Вазьмі ліхтарык, ідзі ў хлявок.
У тваім хляўку добрае дзеецца,
Добрае дзеецца багацеецца,
Сорак каровак ацялілася,
А каровачкі ўсе дратушаткі,
А ўрадзіліся ўсе цялушаткі.
Ах вы дачушкі, вы шчабятушкі.
А вазьміце вы па даёначцы,
А падаіце вы па каровачцы.
А, вы сыночкі, вы сакалочкі,
А вазьміце ж вы ай па дубчыку
Ай па дубчыку па вярбовенькім.
А ганіце ж вы кароў у поле.

Кароў у поле на Юру расу,
На Юру расу, на красну вясну.
Ці кажы дарыць, ці ў хаце бяры,
А мы госцейкі небывалыя,
Небывалыя, няходжаныя.

***Запісана са слоў Ціханковай Ніны Савельеўны, якая пражывала ў аграгарадку Нямойта Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

## Валачобная

Пасціла дзеўка стада каней,
Пасціла дзеўка ды заснула.
Праснулася дзеўка – коней нету.
Пайшла яна лужком-беражком,
Сустрэла дзеўка трох малайцоў:
- Ці не відзелі вы маіх коней? –
Пытаецца яна ў парней.
Першы кажа: "Я не відзеў".
Другі кажа: "Я не бачыў".
Трэці кажа: "Калі адгадаеш сем загадачак,
Скажам і коней пакажам:
А што бяжыць без повада?
А што гарыць без полымя?
А што расце без кораня?
А што чорна не чэрнена?
А што бела не белена?
А што ўецца каля дрэўца?
А што сушыць каля сэрца?"

- Вада бяжыць без повада,
Зара гарыць без полымя,
Камень расце без кораня,
Чорны воран не чэрнены,
Белы лебедзь не белены,
Хмель уецца каля дрэўца,
Любоў сушыць каля сэрца.
- Твае коні на лугу ходзяць,
Ядуць траўку мядунічную,
П'юць вадзічку крынічную.
-А чый гэта дом на гары стаіць?
Да таго дому не ўзабрацца, не ўзабрацца,
І самога пана не дазвацца.
- На гары камень ляжыць,
На камні Ягор стаіць.
-Давайце, братцы, шнуры напінаці.
Ці не зазвініць там званочак?
Ці не выйдзе к нам гаспадарочак?
Ці выйдзе к нам на ганачак?
Ці вынесе нам падаруначак?
А ці сам выйдзе
Ці слугу вышліць?
Ці слугу верную
Ці сына большага?
Надзяе боты нямецкай работы,
Надзяе шапку казачанную,
А шубу аўчынную,
Заве ў хату валачэбнічкаў.
Валачэбнічкі ў хату ўваліліся,
Шчадротам здзіваліся:

На стале стаяць кубачкі:
Горка гарэлка, зеляно віно,
Салодак мядок і піво.
Горка гарэлка – ля самаго яго,
Зеляно віно – ля жаны яго,
Салодак мядок – ля яго дзяцей,
Піво – ля нас, гасцей – валачэбнікаў,
А мы ж госцікі не дакучныя
Раз разочак у гадочак у Вялікадні.

## *Запісана ў в. Лазова Ходцаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

## Добры вечар, пане гаспадару!




Добры вечар, пане гаспадару!
Вясна красна на ўвесь свет.
Слаўны пане, развелічайся!
Адзавіся, слаўны пане!
Ці ўслух табе нашая песня,
Нашая песня – старасвецкая?
Калі ўслужа табе – не тамі ж ты нас.
Не тамі ж ты нас – падары ж ты нас.
Выйдзі-выйдзі ты на ганачак.
Вынесь-вынесь ды падарачак.
Срэбра-злота ды не важачы.
Ды не важачы, ды не лічачы.
Срэбра-злота самі злічым.
Слаўнага пана вазвялічым.

Слаўнаму пану песня спета.
Песня спета проці нова лета.
Проці новага і вясёлага.
Ой, жыві здароў і багацей
І з жаною з маладою.
І з дзеткамі наймілейшымі!
І з брацелямі найкраўнейшымі!
І з суседзямі найбліжэйшымі!
Будзь здаровы, як крынічная вада.
Будзь вясёлы, як хароша вясна.
Будзь багаты, як матухна-зямля.

***Запісана са слоў Бярговінай Антаніны Уласаўны, якая пражывала ў в. Пацкава Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***



Ці ня тучкі ідуць, ці ня воблачкі,
Хрыстос васкрэс на ўвесь свет!
Ідуць, брадуць валачобнікі,
Ідуць, брадуць па ўсяму двару,
Па ўсяму двару гаспадарскаму.
– А мы госцікі не дакучлівыя
Раз-разочак у гадочак аб Вялікадні.
Ці ты спіш, ці ляжыш – не адклікнешся.
Валачобнікі валачыліся,
Цераз кладку шлі, памачыліся,
Зайшлі ў хату, пасушыліся.
– Памасці кладку, пазаві ў хатку:
Чарку гарэлкі, сыр на тарэлкі,

Пару кіўбас, пойдзем ад вас.
Ой, спасіба, цётка, за тваю дару,
За тваю дару за вялікую.



***Запісаны са слоў Трыбуль Антаніны Тарасаўны (1912 г.н.), якая пражывала ў в.Расна Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

Валачобнічкі валачыліся
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Валачыліся, намачыліся
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Зайшлі к бабцы пасушыліся
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Была ў бабкі курка-рабушка
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Нанесла яечак поўны запечак
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Усім валачобнікам па яечку
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Аднаму ж Колечку ды не выстаралась
Хрыстос васкрэс на ўвесь век.

Дам табе, Коля, стада авечак
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Ён авечак не бярэ і дамоў ня йдзе
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Дам табе, Коля, пару каней.
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
А ён каней не бярэ і дамоў ня йдзе.
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Дам табе, Коля, красную дзеўку
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
А ён дзевачку ўзяў і дамоў пайшоў
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!

***Усе разам***
Валачобнікі, валачыліся
Валачыліся, намачыліся
Хрыстос васкрэс на ўвесь век!
Валачобныя– людзі добрыя,
Небывалыя, пажаданыя,
Нячаста ходзім, нямнога просім,
Толькі ў гадочак адзін разочак!

***1-ы валачобнік***
У гэта вялікае свята – Вялікдзень
Ды пойдзем да першага двара.
Ці запросяць да гаспадарскага стала?
3 чырвоным яйкам, з цёплым акенечкам

***2-і валачобнік***
А мы ідзём, ідзём пад багаты дом,
Пад багаты дом “Дзень добры!” даём,
Дзень добры таму, хто ў гэтым даму

***3-і валачобнік***
Гаспадарочак, слынны паночак,
Ці спіш, ці ляжыш, ці адпачываеш?
Ці нас, валачобнікаў, дажыдаеш?

***4-ы валачобнік***
А ці ўслых табе нашы песенкі?
Валачобныя, велікодныя?

***1-ы валачобнік***
Калі няўслых, дык Бог з табою,
Калі ўслых, гукай са мною,
Адкрывай клямачку, заві ў хатачку

***Гаспадар***
Перш чым зваць,
Час ужо і песню заспяваць,
Святочныя віншаванні казаць

***2-і валачобнік***
Дай жа, Божа, пану гаспадару
Жыць і быць, шмат багаццейка нажыць,
Палавіну вам прадаць,
Частку валачобнікам аддаць

***3-і валачобнік***
Дай жа, Божа, пану гаспадару,
Табе і тваім гасцям,
Каб вы пілі-елі,
Вясёленька сядзелі,
Добрыя думкі мелі

## КУПАЛЛЕ

Адным з найбольш яскравых і маляўнічых абрадаў у беларусаў было свята Купалле. Яно захавалася і дажыла да нашых дзён разам з цудоўнымі купальскімі песнямі. Купалле падводзіла рысу доўгім дням (сонца паварочвалася на лета, а лета на спякоту) і аб'ядноўвала ў сабе ўсе культы, абрады, звычаі, якія сустракаліся раней. Прыпадае Купалле на зыход летняга сонцазвароту з 6 на 7 ліпеня. З сонцам быў звязаны будучы ўраджай, багацце траў і раслін, прыплод скаціны, шчаслівае жыццё людзей. Вось чаму такім важным ў купальскім абрадзе з'яўляюцца кастры. Як правіла яны былі вялікіх памераў, каб жыта ўдалося высокім, а ўраджай багатым.

Вогнішчы звычайна разводзілі на ўзвышаных месцах, на берагах ракі. Абавязковым на Купалле было пераскокванне праз вогнішча. У старажытныя часы дазвалялася скакаць толькі парам. Да Купалля ўжо падбіраліся шлюбныя пары. Вяселле ж звычайна спраўлялі пасля збору ўраджаю ці зімою. Увечары ля

вогнішча дзяўчаты вадзілі карагоды, спявалі самыя розныя песні.

З Купаллем звязана шмат дзіўных легенд і паданняў. У народзе верылі, што ў гэту ноч рэкі свецяцца асаблівым нерэальным святлом, а ў іх водах купаюцца душы памерлых у абліччы русалак. Па зямлі ходзяць ведзьмы, чарадзеі і духі, якія імкнуцца нашкодзіць чалавеку, расліны і жывёлы размаўляюць, а сонца на золку ”гуляе“. Убачыць гэтыя цуды, зразумець мову звяроў і птушак можна з дапамогай кветкі папараці, якая зацвітае, згодна з павер’ямі, усяго на імгненне раз у год. Яна давала незвычайную здольнасць бачыць будучыню і знаходзіць усе схаваныя скарбы свету, але раздабыць яе мог толькі вельмі смелы чалавек. Пошук ”папараць-кветкі“ – адзін з самых таямнічых рытуалаў купальскай ночы.

***Запісана са слоў Губарэвіч Кацярыны Сцяпанаўны (1934 г.н.), якая пражывае ў пасёлку Труд Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

Ішла Купалка сялом,
сялом,

Закрыўшы вочкі
пяром, пяром;

На Івана Купала,

На Івана Купала!



Закрыўшы вочкі пяром, пяром,

Вітала хлопцаў чалом, чалом;
На Івана Купала,
На Івана Купала!
Вітала хлопцаў чалом, чалом,
Святліла ночкі агнём, агнём;
На Івана Купала,
На Івана Купала!
Святліла ночкі агнём, агнём,
Пляла вяночкі шаўком, шаўком;
На Івана Купала,
На Івана Купала!
Пляла вяночкі шаўком, шаўком,
Слыла Купалка цяплом, дабром;
На Івана Купала,
На Івана Купала!
Слыла Купалка цяплом, дабром,
Славу Купаллю пяём, гудзём,
На Івана Купала,
На Івана Купала!



## *Запісана ў в. Лазова Ходцаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

## Малая ночка Купаліначка



Малая ночка Купаліначка,
Нашы хлопцы не выспаліся,
За валамі ідуць хліпаючы,
Хвастамі вочы праціраючы.
-Быцю, быцю, пазыч хваста,
Патры вочы пасля ночы.
Вяліка ночка Купаліначка,
Нашыя дзеванькі выспаліся,
За валамі ідуць спяваючы,
Шоўкам хустанькі вышываючы.

## *Запісана ў в.Замашанская Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

Ой, рана, на Івана
Проці Івана ночка мала
Ой, рана, на Івана.
Ой, рана, на Івана,
Дзе Купала, начавала?
Ой, рана, на Івана.

Ой, рана, на Івана.
Начавала ў чыстым полі
Ой, рана, на Івана.

Ой рана, на Івана.
Чым, Купала, вячэрала?
Ой, рана, на Івана.

Ой, рана, на Івана.
Вячэрала белым сырам
Ой, рана, на Івана.

Ой рана, на Івана.
Чым, Купала, запівала?
Ой, рана, на Івана.

Ой, рана, на Івана.
Запівала гарэліцай.
Ой, рана, на Івана.

## *Запісана ў в.Мар'янова Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

Сягоння Ян, заўтра Іван
Дзеўкі зёлкі збіралі.
Што за зёлкі не зналі

І да цара паслалі.
А цар зёлак не пазнаў,
Да царэўны ён паслаў.
А царэўна пазнала,
Усю праўдачку сказала.
Гэтыя зёлкі – купалінкі
Гэтыя дзеўкі –паненкі.



***Запісана са слоў Гайдуковай Надзеі Мікітаўны, (1925 г.н.), якая пражывала ў в.Кавалі Студзёнкаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

## Песні на Купалу



Купала на Івана, Купала на Івана,
Дзе ж ты купала ночку начавала?
Купала на Івана, Купала на Івана,
Начавала ночку у зяленым садочку
Купала на Івана, Купала на Івана
Божа наш, сладкі у нас купальнічак,
Заўтра Ян , пагонім хлопцаў усіх на дзірван,
Божа наш, ах нету, нету Купалішча, як для нашага Мікалая.
Ён на коніку выязжае, сабе дзеваньку выглядае, Божа наш.

*******

Павей , павей , вецярочак, а ты ж на маю русу касу,
Развей касу па валасу, узнай , мілы па галасу.
А я сваю мілку знаю, па голасу спазнаю.
Пяець яна салавейкам, ходзіць яна як зорачка.
Наш пан па садочку ходзіць,
Ды з вішнямі размаўляіць:
-Прыйдуць сення дзеўкі, прынясуць вяночак,
Не з руты , не з мяты, а з божага дару.

## ЗАЖЫНКІ

Пачыналіся Зажынкі ў шчаслівыя дні: у аўторак, чацвер або суботу пад вечар, да заходу сонца. Жняя выходзіла ў поле, брала з сабою хлеб, соль і сыр, клала ўсё гэта на краю нівы. Крыху пазней хлеб, соль і сыр перакладалі на першы, яшчэ не звязаны сноп. Гэта і было своеасаблівае прывітанне, пачастунак і падарунак да сваёй нівы, якая корміць і поіць. Нажаўшы з дзесятак снапоў гаспадыня вярталася дамоў, ды не адна, ішлі грамадою, з суседзямі і іншымі жнейкамі. Ідучы дамоў спявалі жніўныя песні.

Перад Зажынкамі нашы продкі ставілі на стол свянцоную соль і хлеб. Першы ржаны сноп асвяшчалі і ставілі ў куце пад абразамі, дзе ён захоўваўся да наступнага году. У дзень Зажынак абавязкова ладзілася святочная вячэра, дзе людзі весяліліся, спявалі песні.

## *Запісана ў аграгарадку Машканы Машканскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

Кудравая рабінушка,
Баліць мая сірадзінушка
Ад яравога жнівушка.
А чаго ж ёй ні балеці,
Некаму яе пажалеці.
Ай, свёкар жа ні бацюшка,
Ай свёкар ды ні матушка.
Ня вытаплюць мне банюшку,
Ня выпаруць мне сірадзінушку.
Пайшоу свёкар па лядзінушку,
Адсек свёкар дубінушку,
Ды на маю сірадзінушку…







## *Песні, запісаныя са слоў Бірулінай Эммы Лукічны (1937 г.н.), якая пражывала ў в. Розмыслава Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна.*



Ой, зялёна жыта, зялёна,
Харошыя госці ў мяне.
Зялёнае жыта за сялом,
Харошыя госці за сталом.
Ой, зялёна жыта, зялёна,
Харошыя госці ў мяне.
Зялёнае жыта жонкі жнуць,
Харошыя госці ў мяне пьюць.

Ой, зялёна жыта, зялёна,
Харошыя госці ў мяне.
Зялёнае жыта на раду,
Харошыя госці да ладу.
Ой, зялёна жыта, зялёна
Харошыя госці ў мяне.
Зялёнае жыта – асака,
Прыехалі госці здаляка.



## *Запісана ў в. Сяргейкі Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*



Сёння ў нас Зажынкі:
Жнейкі жыта зажыналі,
У снапочкі павязалі,
Свайго гаспадара
Снапамі звязалі.

Наш гаспадарок
маладзенькі,
Яго конік вараненькі.
Ён на поле паязджае,
Сваіх жнейкаў аглядае:
-Жніце, жнейкі, не стаіце.
А зшаўшы, снапочкі павяжыце.

Наш гаспадарок маладзенькі,
Яго конік вараненькі.
Ён на поле паязджае,
Усё поле аб`ехаўшы,
Сваіх жнейкаў да й гукае:
Жніце, жнейкі, не стаіце,
А пажаўшы адпачніце.



### *Запісана ў в. Вялікі Азярэцк Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

Радзі, божа, жыта
На другое лета,
Радзі божа!
На другое лета,
Лепшае за гэта.
Радзі, божа.
На полі снапамі,
А ў гумне таркамі
Радзі, божа!

Найбольш хвалюючымі былі Дажынкі. Яно адзначалася ў дзень заканчэння жніва. Жнеі апраналіся ў лепшае адзенне, а гаспадыня гатавала святочны абед. Калі дажыналі жыта, у канцы поля, пры мяжы пакідалі невялікую лапіну незжатага і гаварылі: “Трэба пакінуць звярам”

### *Запісана ў в. Малы Азярэцк Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна*

Ды хвала Богу дажаліся,
А Петрыны засталіся!
Нашы жнейкі маладыя,
У іх сярпочкі залатыя.

Яны жалі-спявалі
Сярпы пазначалі
У Петрыкавых жнейкі старыя,
У іх сярпы паламаныя,
Яны жалі дралі.
Сярпы паламалі.
Дзякуй Божа за Дажынкі,
Было піва і гарэлка.
Што спілі і з’елі прыспарай, божа,
Што каму далі – напаўняй, божа.



## ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД

***Запісаны са слоў Высоцкай Зінаіды Анісімаўны (1938 г.н.), якая пражывала ў в.Сінягорская Студзёнкаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

Першы дзень вяселля гулялі жаніх і нявеста са сваімі гасцямі раздзельна кожны ў сваім доме. Гэта былі провады маладосці, благаславенне бацькоў на шлюб. Другі дзень снедалі дома, а потым жаніх са сваёй раднёй і дружбакамі ехалі да нявесты. Нявеста чакала жаніха і калі прыязжалі госці, сяброўкі нявесты

патрабавалі ад жаніха выкуп за нявесту. Выводзілі яму другую нявесту, жаніх і яго сябра таргаваўся, плаціў грошы. Калі ўсе былі задаволены выкупам, нявесту выводзіла цешча, а зяць ёй падаваў каравай. Гасцей запрашалі ў хату і садзілі за стол. Брат нявесты “адразаў касу” нявесце (не на самой справе), патрабаваў выкуп, а жаніх плаціў грошы, каб той “не адрэзаў касу”. Потым цешча падносіла закрытую яешню, зяць угадваў колькі яец у яешні, калі не адгадваў, плаціў грошы цешчы. Затым зяць частаваў усіх гэтай стравай.



Прыданае, падушкі прадавалі жаніху хросныя, жаніху трэба было зноў плаціць за падушкі. Забіралі прыданае і нявесту і ехалі гуляць да жаніха. Сустракалі маладых бацькі жаніха з хлебам і соллю. Нявеста падавала свой каравай. Запрашалі ўсіх за стол. Затым нявеста кідала свой букет сяброўкам, свякроў здымала фату і павязвала платок. Затым зноў усіх запрашалі за стол. Вяселле праходзіла з песнямі, прыпеўкамі, жартамі і танцамі. Пасля застолля госці збіраюцца дамоў, дзякуюць сватоў за пачастункі, нявеста застаецца ў хаце жаніха.

Трэці дзень гуляюць ў доме жаніха. Накрываюць стол, а пад сталом сядзіць “сучка” у вывернутым кажуху. “Сучка” хоча адабраць туфель у нявесты, калі ёй удасца зняць туфель, жаніху трэба расплаціцца. Ідзе барацьба каб не аддаць туфель “сучцы”. Жартуюць, смяюцца, спяваюць песні, танцуюць. Так заканчваецца свадзьба.

Перазоўкі. Абавязкова праз тыдзень зяць едзе да цешчы з падарункамі. Ён вязе чырвонае віно і цукеркі. Таксама з ім едуць бацькі. Знаёмства са сватамі праходзіць бліжэй.

Затым праз тыдзень бацькі нявесты едуць праведаць дачку і зяця, а таксама сваіх сватоў. За сталом вядуць бяседу, пяюць песні. Так і заканчваюцца свадзебныя застоллі. Маладыя пачанаюць новае жыццё.



## *Запісаны са слоў Галавач Яўгеніі Міхайлаўны (1930 г.н.), якая пражывала ў в. Нямойта Сенненскага раёна*

### Малады едзе да маладой



Па небу месячок коціцца,
Толечка ў мамачкі просіцца:
"Пусці мяне, маманька, на адну ноч.
Заўтра к абеду прыеду,
Прывязу скрыню, пярыну,
Маладую Валечку-княгіню.
Табе, мамачка – дачушка,
А мне, мамачка – падружка.
Старому, малому піць падаць,
А мне маладзенькаму пасцель слаць".

### Маладая сядзіць за сталом, а ёй спяваюць



Я ўчора думала,
Я і сёння думала,
Я і сёння думала,
Што мне з мамкай не жыць.
Што мне з мамкай не жыці,
Па садочку не хадзіці,
Цвяточкаў не рваці,
Вянкоў не плесці.
Адзін была звіла
І той не знасіла,

Падружцы падарыла.
Падружка мая родная,
Панасі мой вяночак
Сёлятні гадочак.

## **Як прыехаў малады за маладой** (яму спяваюць)

Чырвоны мак, чырвоны мак
І ў гародзе чырвоны мак.
Чырвоны мак, у гародзе чырванеей,
Толечка, у карагодзе чырванеей.
Толечка ў карагодзе пазавіў
Кудрачкі маладзецкія
Ля сваей славанькі ўсей ацецкія,
Каб яго цешчунька ўхваліла,
Каб яго Валечка ўлюбіла.
Любіла Валечка – любіць будзе,
Хваліла цешчунька – хваліць будзе.



## Малады прыводзіць маладую к сабе дадому

Выйдзі, Ганначка, на ганак,
Сустрэнь пара дзетак:
Аднаго раджонага, другога сужанага.
Раджонае радам стала,
Сужонае ў ножкі пала.



## Спяваюць маладой

Куды ты, груша, нахілілася:
Цераз тын ды на вуліцу?
Там цябе, груша, калаціць будуць,
Кішэнькі, карманкі напаўняць будуць.
Куды ж ты, Кацечка, сабралася?
Цераз бор к свякроўцы ў двор?
Там цябе, Кацечка, шанаваць не будуць,
Там цябе раненька на работку пасылаць будуць,
Позненька з работкі дажыдаць будуць.

## Спяваюць маладому

Ай, едзь, едзь, Толечка, не станавіся,
Не станавіся пад калінаю.
Каліна – дрэва не шчаслівае:
Карэнне каліны вада моіць,
Ствол каліны мошкіточаць,
Ягады каліны птушкі клююць.
А едзь, Толечка, ды пад егораю астанавіся.
Егора – дзерава шчаслівае:
Пад егораю дзеўкі гуляюць,
Вянкі заплятаюць.
Там твая Кацечка ў хараводзе гуляе,
Свайго суджанага паджыдае.

## Маладому

Ай борам, барамі
Выслата дарожка рублямі.
Хто гэту дарожку высцілаў?
Выслаў дарожку Васечка,
Да сваёй Кацечкі ходзячы,
Вечныя падарункі носячы:
Першы падарунак – бараначак,
Другі падарунак – пярсцёначак,
Трэці падарунак – конь вараны,
Чацвёрты падарунак – сам малады.

***Запісаны са слоў Трыбуль Антаніны Тарасаўны (1912 г.н.), якая пражывала ў в.Расна Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***



Драмліва поле, драмліва,
На ягадачкі ўрадліва.
Ніхто ў тым полі не бываў,
Ніхто тых ягадак не збіраў.
Наша Танечка бывала,
Тыя ягадкі сабірала.
Беручы ягадкі заснула.
Прыехаў Сярожачка,
не чула
Махнуў платочкам, не дастаў.
Пакаціў пярсцёнак, не дакаціў.
Ён злез з коніка, пабудзіў.
Устань, мая Танечка, прачніся,
На табе вадзіцы, умыйся.
На табе платочак, утрыся.
На табе яблачка, пахмяліся.
На табе другое, садовае
На табе трэцяе, лепшае
Ты ж у мяне жоначка вечная.

***

Стаяла Танечка пад ляском,
Гукала мамачку галаском.
-Хадзі, мамачка, да дому.
Няма парадачку ні ў чому.

-Не пайду, дачушка, не пайду.
У цябе ёсць татачка ў даму.
Ён дасць парадак усяму.
І тым госцейкам зазваным,
І тым суседзям сабраным.

***Запісаны са слоў Сідаровіч Рэгіны Мікітаўны (1941 г.н.), якая пражывала ў в.Расна Нямойтаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

На моры Галечка кубкі мыла,
Мыючы кубачкі ўплаў пусціла.
Плывіце ж кубачкі ў свёкраў двор,
Я ж у панядзелак сама там буду,
Я ж сваіх госцікаў частаваць буду.
Ужо ж мае кубачкі паўнюсенькі,
Ужо ж мае госцейкі п'янюсенькі.
А ўжо ж мае кубачкі цераз льюцца,
А ўжо ж мае госцейкі дамой рвуцца.

***

А спасіба, сваток, за гарэлку,
Насыціла душу на нядзельку.
А спасіба, сваток, за мядок.
Насыціла душу на гадок.
А спасіба, сваток, за хлеб, соль,
Ужо ж паедзем мы ў свой двор.
Там нам вячэра гатова,
Там нам пасцеля сцелена.
Гатова вячэра, пампушкі,

Сцелена пасцеля, падушкі.
Гатова вячэра ў печы,
Сцелена пасцеля ў клеці.

***Запісаны са слоў Васілёнак Жанны Аляксееўны (1939 г.н.), якая пражывае ў в.Запруддзе, Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***



Ляцеў салавей па сталу,
Памачыў крыльца ў вянцо.
Сушыся салавей, сушыся.
А ты дачушка вучыся,вучыся,
Як свякровачцы ўгадзіць.
Угаджу, мамачка, угаджу,
Я ей хатачку падмяту,
Я ей печачку затаплю,
Я ей вячэрачку навару.
Я ей каровачку падаю
Угаджу, мамачка, угаджу.

***Запісаны са слоў Васілёнак Зінаіды Сяргееўны (1941 г.н.), якая пражывае ў в.Запруддзе, Багданаўскага сельскага Савета Сенненскага раёна***

Ой там, на таргу, на базары
Жонкі мужыкоў прадавалі.
Як прыдзецца да ладу
То я свайго павяду ды прадам.
Я з лыка вяроўку ссукала,

І злых матузоў навязала,
Паехалі на базар
Да цялегі мужа прявязала.
Як наехалі там пакупніцы,
Як наехалі там таргавіцы.

Сталі думаць і гадаць
Шта за майго мужа даць.
“За гэтага мужа трэба даці
За гэтага мужа трэба даці:
Пару коней вараных
І сто рублёў дакласці”.

Падумала я падумала,
Падумала я падумала,
Трэба з конямі вазіцца,
А з грашамі ды насіцца,клопатна.

А хто паарэ, ды пакосіць?
А хто паарэ, ды пакосіць?
Ен пакосіць, паарэ,
Не для каго, для мяне- не прадам.

Ой там, на таргу, на базары
Жонкі мужыкоў прадавалі.
А мой мілы чарнабровы,
Да работы не лянівы,
Ён самой мне прыгадзіцца.



***

Чым я не хазяйка,чым не гаспадыня.
У агародзе лебяда, у хаце павуцінне.
Едуць людзі з поля ды з мяне смяюцца
Што у маіх падушках вораны нясуцца.

*Прыпеў*: *Праўда людзі, праўда я,*
*гаспадыня добрая.*
Ой, не смейцесь людзі, што з гэтага будзе,
Пашчыпаю я варон , ды пярына будзе.
*Прыпеў:*

Пайду да суседа, парадак убачу.
Як прыду да дому, дык усё папрачу.
*Прыпеў:*

Як прыйшла да даму, стала ўсё ўбіраці.
Замарыў мяне сладкі сон, і я легла спаці.
*Прыпеў:*

Ох, я маладзенькая, трохі загулялася,
У агародзе лебяда ўся засталася.

# Ехалі казачэнькі



Ехалі казачэнькі лесам, далінаю,
Там сустрэлі дзяўчыначку
З длінаю касою.
Прыпеў: Каса ўецца да пояса,
Уецца за плячамі.
Паехалі, дзяўчыначка,
З намі казакамі.

Адказала ім дзяўчына:
- Ехаці не буду,
Я ж свайго любага
Вавек не забуду.
Прыпеў: Выйдзі, выйдзі, мой міленькі,
Ды да маёй хаты.
Там цябе сустрэну я
У роднае маці.

Там сустрэну любага,
Шчыра ўсміхнуся.
У ногі сваёй мамачцы
Нізка пакланюся.
Прыпеў: Выйдзі, выйдзі, мой міленькі,
Ды да маёй хаты.
Там цябе сустрэну я
У роднае маці.

## *“СКАЗАЎ ЯК ЗВЯЗАЎ”*
## **(прыказкі і прымаўкі)**

Дзе пасееш густа, там не будзе пуста.
Сей у добрую пару – збярэш хлеба гару.
Што спіна зробіць, тое рот схопіць.
Ідзеш на часок, бяры хлеба кусок.
Доўгі дзень з ранку да вечара, калі рабіць нечага.
У суседстве жыць – адзін другому служыць.
Свая хатка як родная матка.
Няма смачней вадзіцы як з роднае крыніцы.
Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне.
Жыць на чужой старонцы, як на скале адзінокай сасонцы.
З роднага боку і варона мілая.
Горка рэдзька, ды ядуць, кепска замужам, ды ідуць.
Няма цяжэй кары, чым жыць без пары.
Муж і жонка – найлепшая суполка.
Няхай сабе гаспадар з лапаць, абы з ім не плакаць.
Маміна крыло і ў мароз грэе.
Пры сонейку цёпла, пры мамцы добра.
Дзетак гадаваць – не курак пасклікаць.
Кожная матка – не вораг свайму дзіцятку.
Бацькоўскае слова дарэмна не гаворыцца.
Старэйшы брат як другі бацька.
Добры пачатак – палавіна справы.

# ЗМЕСТ

Прадмова……………………………………1 – 2 с.

Каляды………………………………………2 – 3 с.

Калядныя песні ……………………………3 – 12 с.

Масленка……………………………………13 –18 с.

Вялікдзень …………………………………18 – 28 с.

Купалле……………………………………...28 – 34 с.

Зажынкі……………………………………...34 – 38 с.

Вясельны абрад……………………………..39 – 50 с.

Прыказкі і прымаўкі………………………...51с.

